УДК 061.234

# УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА НА БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

*Н.В.ДАЎГЯЛА*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

***Разгледжаны станаўленне і развіццё уніяцтва на Беларусі ў канцы 80 - 90-х гг. XX ст. Праведзены аналіз абрадавасці і іерархічнай структуры беларускай грэка-каталіцкай царквы.***

Рэлігійны і сацыяльны фактары (у адрозненне ад нацыянальнага) заўседы адыгравалі вядучую ролю ў гісторыі Беларусі. Пытанне наконт рэлігійнай прынадлежнасці мела важнае значэнне ва ўсіх палітычных падзеях: і як падстава для палітычнай барацьбы, і як фактар, які вызначаў сітуацыю. Галоўным для людзей усіх гістарычных эпох быў не адказ на пытанне: «Хто ты - беларус, літовец ці паляк?», а іншая праблема: «Хто ты - праваслаўны ці католік?» Менавіта гэта і вызначала ўсю спецыфіку ўзаемаадносінаў. Сення, у пачатку трэцяга тысячагоддзя, і рэлігія і рэлігійны досвед таксама займаюць значнае месца ў жыцці беларускага грамадства. Абуджэнне цікавасці да духоўнай спадчыны, узнаўленне дзейнасці рэлігійных арганізацый прывялі ў храмы і абшчыны амаль палову (як сведчаць сацыялагічныя даследаванні) беларусаў. На сённяшні дзень у Беларусі існуе 26 рэлігійных напрамкаў. Па дадзеным, на 01.01.2003 г. было зарэгістравана 2830 рэлігійных арганізацый [1, с. 33]. Пік іх росту быў адзначаны ў 1995 г., калі ўзнікла 344 рэлігійныя арганізацыі (для параўнання - ў 1994 г. узнікла 157 [2, с. 4], а ў 2002 г. - 56).

Спецыфіка рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі вызначаецца перш за ўсе яе геапалітычным становішчам: на сутыку заходняй і ўсходняй цывілізацый, з суіснаваннем альбо пачарговым дамінаваннем розных хрысціянскіх канфесій. Сярод іх значнае месца займае і уніяцтва. Трэба адзначыць, што ў XX ст. Уніяцкая царква тры разы імкнулася прайсці складаны працэс адраджэння, заваяваць статус беларускай нацыянальнай рэлігіі. Уніяцкі рух, нягледзячы на скасаванні і забароны, якія ўзнікалі ў розныя часы, знаходзіў водгук у народзе. Аб гэтым сведчыць і тое, што пасля ўказу 1905 г., частка праваслаўных (былых уніятаў) перайшла ў каталіцтва, і досыць моцны уніяцкі рух на Магілеўшчыне ў 20-я гады, і хуткае ўзнікненне і распаўсюджванне уніяцкіх суполак на землях Заходняй Беларусі, а таксама тое, што ў 90-я гады, нягледзячы на амаль 50-гадовы перапынак, уніяцкі рух узнік зноў.

Кожны раз, узнікаючы на хвалі беларускага адраджэння, уніяцкая царква садзейнічала ўсведамленню беларусамі сваей нацыянальнай прыналежнасці. Фактычна дадзеныя працэсы (беларускі рух адраджэння і спробы аднавіць уніяцкую царкву) паўстаюць у Беларусі адначасова, а іх заснавальнікамі выступаюць адны і тыя ж людзі. Пачынаючы з К. Каліноўскага, напрацягу 130-гадовага перыяду уніяцтва раз за разам аказвалася ў цэнтры ўвагі беларускага руху. Можна сказаць, што яно стала часткай беларускай нацыянальнай ідэі. Але далей ідэялагічнага і гістарычнага абгрунтавання ролі і месца уніяцтва ў жыцці беларускага народа справа не пайшла. Лозунг «Уніяцтва - нацыянальная рэлігія беларусаў» не знайшоў поўнай падтрымкі нацыі, а грэка-каталіцкай канфесіі не знайшлося месца паміж каталіцтвам і праваслаўем [3, с. 16]. Але, нягледзячы на моцную народную падтрымку, уніяцкая царква ў XX ст. толькі аднойчы мела дзяржаўную падтрымку - пад час існавання Беларускай Народнай Рэспублікі.

З другой паловы 80-х гадоў у беларускім грамадстве зноў пачала абмяркоўвацца праблема грэка-каталіцкай царквы. Маладзежныя, нацыянальна-культурныя і дэмакратычныя арганізацыі, у першую чаргу «Талака» і «Канфедэрацыя беларускіх суполак» (66 арганізацый) патрабавалі даць магчымасць аднавіць сваю дзейнасць беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царкве і беларускай грэка-каталіцкай царкве.

На арганізацыйным з'ездзе БНФ (Вільнюс, чэрвень 1989 г.) тэзіс аб уніяцтве як аб беларускай нацыянальнай царкве, увайшоў у прынятыя праграмныя дакументы. У раздзеле «Рэлігія і грамадства» адзначалася наступнае: «Уніяцтва, узнікшае ў канцы XVI ст. як аб'яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, на працягу XVII - XVIII стст. стала самым масавым веравызнаннем, паслядоўна выкарыстоўвала ў службах беларускую мову і было забаронена царскім урадам у першай палове XIX ст. У гісторыі праваслаўя і каталіцтва таксама былі перыяды іх звароту да беларускай мовы, але гэтыя канфесіі ў розныя часы з'яўляліся сродкам русіфікацыі і паланізацыі беларусаў. У выніку - пэўная частка беларусаў-католікоў стала лічыць сябе палякамі, а многія праваслаўныя беларусы называць сваю веру «рускаю» [23, с. 16].

Хутка ў СМІ разгарнулася дыскусія аб ролі і месцы рэлігіі ў іерархіі культурна-гістарычных каштоўнасцяў беларускай нацыі. Пры гэтым у чарговы раз паўстала пытанне аб уніяцкай царкве. Пік спрэчак прыйшоўся на канец 80-х - пачатак 90-х гадоў. Погляды зноў раздзяліліся. Але, нягледзячы на наяўнасць шматлікіх публікацый, іх аўтары практычна не выходзілі за межы палемікі, вядомай яшчэ з часоў Расійскай імперыі. У новых умовах паўтараліся старыя аргументы, факты і высновы. Права-

слаўныя свяшчэннаслужыцелі не толькі ўсяляк перашкаджалі арганізацыйнаму станаўленню уніяцкай канфесіі, але і публічна выказвалі свае негатыўныя адносіны да яе. «Унпатство - это агрессня католнцнзма протнв православной церквн», піша ў артыкуле «Какая церковь была нацнональной» протаіерэй, кандыдат багаслоўя, выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі Сяргей Гардун [3, с. 16]. Не скрываў сваіх рэзка адмоўных адносіна да уніяцтва і экзарх Усея Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. У сваім інтэрв'ю польскаму часопісу ён сцвярджаў, што «уннатство свое отжнло» [3, с. 16].

Праваслаўная (а часам і каталіцкая ) эліта і па сённяшні час выказваюць думкі пра тое, што уніяцтва - гэта «штучны твор», які ўяўляе сур'езную перашкоду для дыялогу паміж праваслаўнымі і католікамі.

Паралельна са спрэчкамі прымаліся практычныя крокі па адраджэнню беларускага уніяцтва.

Першая грэка-каталіцкая абшчына ўтварылася ў Мінску 21 верасня 1990 г. [4, с. 27]. У хуткім часе адбыўся ўстаноўчы сход мінскіх грэка-католікоў, на якім была абрана Царкоўная Рада гарадской грэка-каталіцкай абшчыны. Першай унутрыцаркоўнай праблемай стала вырашэнне пытання адносінаў з царкоўным цэнтрам: вышэйшых уніяцкіх іерархаў, якім маглі б падпарадкоўвацца абшчыны, вядома ж, не існавала, а падпарадкаванне уніятаў іерархам лацінскага абраду, як вядома з гісторыі, заўседы мела для іх згубныя вынікі. У гэтай сітуацыі новаўтворанай грэка-каталіцкай абшчынай было вырашана звярнуцца на Украіну, дзе уніяцкая царква ўжо аднавілася ва ўсёй сваёй былой моцы. 19 кастрычніка 1990 г. Кіева-Галіцкі мітрапаліт, архібіскуп Львоўскі Уладзімір даў мінскай грэка-каталіцкай абшчыне грамату аб прыналежнасці яе да старадаўняй Кіева-Галіцкай мітраполіі. 30 кастрычніка такую ж грамату атрымала другая уніяцкая абшчына, якая была ўтворана ў Гомелі. І ў той жа дзень, мітрапаліт Уладзімір прызначыў святара Пятра Кузьмічова дэканам грэка-каталіцкіх абшчынаў і вернікаў Беларусі, тым самым паклаўшы пачатак арганізацыйнай будове будучай Беларускай грэка-каталіцкай царквы [4, с. 27].

На працягу верасня - лістапада 1990 г. Грэка-каталіцкія абшчыны паўсталі ў Полацку, Магілеве. Распачаўся рух у Віцебску. Менавіта туды 12 лістапада 1990 г. прыехалі з Львова 7 уніятаў на чале са святаром, каб ушанаваць памяць уніяцкага святога пакутніка Язафата Кунцэвіча і паставіць на месцы яго смерці, на беразе Заходняй Дзвіны, памятны крыж. Але, па меркаванню дзяржаўных органаў, акцыя была супрацьпраўнай і не спрыяла захаванню грамадзянскага спакою, бо ўносіла разлад паміж прадстаўнікамі праваслаўя і каталіцтва. Таму органы ўлады не далі дазволу на гэта паломніцтва. Адказам стаў мітынг пратэсту [5, с. 65].

20 лістапада 1990 г. беларускія грэка-католікі адаслалі ліст Папе Рымскаму Яну Паўлу, у якім было заяўлена аб адраджэнні уніяцкай царквы ў Беларусі. Ліст падпісалі дэкан грэка-каталіцкіх суполак і вернікаў Беларусі айцец Петр Кузьмічоў, старшыня мінскай грэка-каталіцкай абшчыны Сяргей Абламейка, старшыня полацкай грэка-каталіцкай абшчыны Мікола Шарах, старшыня гомельскай грэка-каталіцкай абшчыны Алег Лабун, ад грэка-католікаў Наваполацка Анатоль Кулік, ад грэка-католікаў Стаўпцоў Ігар Міхно [4, с. 28].

Уніяцкі рух пашыраўся. Царкоўныя грамады былі ўтвораны ў Бягомлі, Гродна і Старых Дарогах. 18 траўня 1991 г. адбылася першая уніяцкая імша ў г. Магілеве [6, с. 4]. Шмату якіх гарадах і мястэчках уніяцкія абшчыны знаходзіліся на стадыі фармавання. У выніку на пачагак 1996 г. у краіне налічвалася 15 уніяцкіх парафій [7, с. 102]. З 1990 г. беларуская уніяцкая грамадскасць пачала выдаваць рэлігійна-культурны часопіс «Унія». Мэта часопіса - адраджэнне і папулярызацыя уніяцкай царквы на Беларусі, абуджэнне нацыянальнай свядомасці і выхаванне хрысціянскай культуры. Выйшла 5 нумароў часопіса. Таксама выдаюцца газеты «Царква» (з 1995 г.), «Шлях да Хрыста» (з 1999 г.), «Наша вера» (з 2000 г.).

1996 г. быў юбілейным годам для уніяцкай царквы, бо менавіта 400 гадоў таму была заключана Брэсцкая царкоўная унія, з якой і пачалося існаванне грэка-каталіцкай царквы на Беларусі. Юбілейныя святкаванні адбываліся на працягу кастрычніка - лістапада 1996 г. і скончыліся юбілейнымі ўрачыстасцямі ў Брэсце. Туды з'ехаліся прадстаўнікі амаль усіх беларускіх грэка-каталіцкіх парафіяў, а таксама святары з Украіны, Расіі, Польшчы, Чэхіі.

Адраджэнне грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ставіць перад клірам і вернікамі новыя пытанні, якія не былі актуальнымі яшчэ 5-8 гадоў таму. Адно з такіх пытанняў - пра абрадавую ідэнтычнасць уніяцкай царквы. На сённяшні дзень існуе некалькі шляхоў развіцця абраду. Асноўныя з іх наступныя:

1. Узяць за аснову чыста грэцкі абрад. Але гэты абрад з цягам часу стаў даволі значна адрознівацца ад абрадавых практык славянскіх народаў. Такі абрад быў бы сёння на беларускіх землях не больш чым хрысціянскай экзотыкай з Блізкага Усходу.

2. Узяць за аснову той праваслаўны абрад, які зараз пашыраны ў Беларусі. Але, як лічуць многія святары, а таксама навукоўцы, гэты абрад перажывае сёння пэўныя крызісныя з'явы. Ен выявіў сваю непрыстасаванасць да сучаснага парафіяльнага жыцця: доўгія службы, строгія пасты, адсутнасць лаваў у храмах і г.д.

3. Адрадзіць той абрад, які існаваў на Беларусі да скасавання уніі (з сярэдзіны XVIII ст.). Трэба адзначыць, што беларускі грэка-каталіцкі абрад заўсёды фармаваўся на аснове зліцця заходніх і ўсходніх хры-

сціянскіх традыцый, але ў гэты час заходнія (каталіцкія) элементы адыгрывалі ў ім дамінуючую ролю [8, с. 14].

4. Адрадзіць той абрад, які быў у уніяцкай царквы на Беларусі ў перыяд яе росквіту. Але і на гэтым шляху таксама шмат цяжкасцяў, бо тыя богаслужбовыя кнігі, якія дайшлі да нас з тых часоў, не здольныя даць поўнага ўяўлення пра тагачасны абрад.

5. Перанесці на Беларусь той абрад, што дзейнічае зараз на Украіне (дамінуюць усходнія (праваслаўныя) элементы). Існуе шмат прыхільнікаў гэтага шляху развіцця абраду. Але ёсць і іншае меркаванне, згодна з якім гісторыя уніяцкай царквы на Украіне значна адрозніваецца ад гісторыі уніяцкай царквы ў Беларусі і таму браць за аснову абрад, які практыкуецца на Украіне не самы ідэальны варыянт.

Як бачна, існуе шэраг самых розных меркаванняў, але канчаткова пытанне аб тым, якім будзе абрад беларускай грэка-каталіцкай царквы яшчэ не вырашана.

Наконт мовы набажэнстваў такой дыскусіі, як наконт абраду, не існуе. Беларуская мова ўсталявалася ўжо як літургічная мова уніяцкай царквы, нават нягледзячы на недахоп перакладаў асобных літургічных тэкстаў. Але шмат святароў лічуць, што не трэба зусім адкідваць царкоўна-славянскую і расійскую мовы, бо рэчаіснасць такая, што шэраг вернікаў жадалі б маліцца і на гэтых мовах.

Калі казаць пра структуру грэка-каталіцкай царквы, то трэба адзначыць, што ў іншых краінах, а менавіта ва Украіне, Чэхіі, Польшчы, яна мае наступны выгляд: ніжэйшай адзінкай з’яўляецца парафія, якую ўзначальвае парах. Парафіі аб’ядноўваюцца ў дэканат на чале з дэканам. Дэканаты аб’ядноўваюцца ў экзархат на чале з экзархам, экзархаты - у дыяцэзію на чале з патрыярхам. Патрыярхі грэка-католікоў падпарадкоўваюцца Апостальскаму пасаду, які ўзначальваецца Папам Рымскім [9, с. 177].

Што датычыцца Беларускай грэка-каталіцкай царквы, то яна на сёняшні дзень не мае сваей іерархічнай структуры. Аднак гэтая справа здаецца не зусім простай у сувязі з заснаваннем мітрапалітам Шаптыцкім экзархата для беларусаў грэка-католікоў (пад час другой сусветнай вайны). Пасля смерці экзарха А. Неманцэвіча, Апостальская сталіца не выдала дакумента, які скасаваў бы вышэйзгаданы экзархат. Ён існуе, але застаецца вакантным да сённяшняга дня.

Адсутнасць іерархіі да цяперашняга часу выклікана не недахопам зацікаўленасці гэтай справай з боку царкоўных улад, а аб’ектыўным станам грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі.

Каардынацыю дзеянняў паміж Ватыканам і Беларускай грэка-каталіцкай царквой здзяйсняе апостальскі візітар Кангрэгацыі Усходніх цэркваў Ватыкана. Зараз гэту пасаду займае айцец архімандрыт, доктар тэалогіі, прафесар Люблінскага каталіцкага універсітэта Ян Сергій Гаек [9, с. 178].

Дэканам Беларускай грэка-каталіцкай царквы з 1994 па 1998 гг. быў Ян Матусевіч. З 1998 г. па сённяшні час дэканам з’яўляецца айцец Віктар Данілаў. На сёняшні дзень на Беларусі дзейнічае 13 абшчын: дзве ў Мінску, астатнія (па адной) у Брэсце, Гродна, Гомелі, Магілёве, Віцебску, Маладзечна, Лідзе, Полацку, Стаўбцах [10, с. 332]. Найбольш буйная з іх знаходзіцца ў Мінску. Узначальвае яе пробашч Казімір Ляхові͏ч [11, с. 1]. Астатнія малаколькасныя - у іх налічваецца 16 - 30 чалавек, у асноўным ва ўзросце 25 - 50 год; сацыяльны склад - пераважна інтэлігенцыя [5, с. 75]. Гэтыя абшчыны абслугоўваюцца толькі 9 свяшчэннаслужыцелямі. Таму пытанні падрыхтоўкі кадраў святароў знаходзяцца ў цэнтры ўвагі канфесіі. Зараз кандыдаты ў святары праходзяць навучанне ў духоўных навучальных установах Англіі, Чэхіі, Польшчы, Украіны.

На шляху свайго станаўлення уніяцкая царква сутыкнулася са шматлікімі цяжкасцямі Адной з першых перашкод стаў Закон СССР «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» 1990 г, які не дазваляў новаствораным рэлігійным абшчынам рэгістравацца і браць сабе храмы да 1 ліпеня 1991 г. З 1992 г. дзяржаўна-рэлігійныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь будаваліся ў адпаведнасці з Законам «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях» (снежань 1992 г.) [12, с. 18]. Законам былі створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця ўсіх рэлігійных веравызнянняў, у тым ліку і уніяцтва. Але ў 2002 г. была прынята новая рэдакцыя Закона. Былі зменены наступныя палажэнні:

- кіраўнікам рэлігійнай арганізацыі можа быць толькі грамадзянін Рэспублікі Беларусь. Замежныя грамадзяне могуць выконваць гэтую функцыю толькі адзін год;
- распаўсюджваць рэлігійную літаратуру магчыма толькі пасля заключэння спецыяльнай камісіі;
- у рэлігійную абшчыну для рэгістрацыі павінна ўваходзіць не менш дваццаці грамадзян Рэспублікі Беларусь;
- рэлігійнае аб’яднанне можа ўзнікнуць толькі пры наяўнасці дзесяці рэлігійных абшчын, з якіх хаця б адна павінна існаваць і дзейнічаць на тэрыторыі Беларусі не менш дваццаці год [1, с. 33].

Відавочна, што вышэйадзначаныя папраўкі ў Закон стануць сур’езнай перашкодай на шляху адраджэння грэка-каталіцкай царквы. Увогуле прадстаўнікі грэка-каталіцкіх парафій лічуць, што ў Беларусі праводзіцца палітыка выкаранення уніяцтва. Уніятам вярнулі толькі адзін з шматлікіх храмаў, якія былі пабудаваны ў перыяд дзейнасці Брэсцкай царкоўнай уніі. Сення грэка-католікі спраўляюць службу ў прыватных памяшканнях і храмах рыма-каталіцкай царквы. Толькі ў Полацку мясцовая абшчына пабу-

давала царкву. Дзяржаўныя структуры не ідуць на тое, каб вярнуць культавыя будынкі, якія раней належалі уніятам.

Такім чынам адраджэнне уніяцкай царквы на Беларусі адбываецца ў складаных умовах. Не хапае святароў, адсутнічаюць храмы. Але гэта не прычына для роспачы ці бяздзеяння. Наадварот, такая сітуацыя яшчэ больш мабілізуе і абавязвае грэка-католікоў. Яны з аптымізмам глядзяць у будучыню. Падставай для гэтага з'яўляецца павелічэнне, хоць і павольнае, вернікаў, якія ад дзядоў і прадзедаў збераглі уніяцкую веру і гатовы адраджаць яе далей.

З вялікай надзеяй беларускія уніяты чакаюць маладых святароў, якія вернуцца на Беларусь пасля заканчэння заходніх семінарыяў у Празе і Брацiславе, Лондане і Рыме і пачнуць апостальскае служэнне. Менавіта тады царква зможа аднавіць свой вобраз, сваю ментальнасць.

Беларуская уніяцкая царква падтрымлівае цесныя сувязі з грэка-каталіцкімі абшчынамі Чэхіі, Польшчы, ЗША, Канады і асабліва Украіны. З пачаткам адраджэння уніяцтва ўкраінскія святары служылі першыя святыя літургіі, хрысцілі вернікаў, прапаведвалі слова Божае ў Полацку, Віцебску, Мінску. На Украіне, у Львове, Івана-Франкоўску, атрымліваюць адукацыю беларускія святары. Менавіта манахі-студыты з Украіны заснавалі ў Полацку першы грэка-каталіцкі манастыр. Ужо традыцыйнымі сталі пілігрымкі беларускіх вернікаў да святыняў у Тошаве, Зарваніцы, Уніве, Крэхаве. Адначасова ўкраінскія святары, манахіні прыязджаюць для вядзення місійнай дзейнасці ў беларускіх парафіях.

З вялікім спадзяваннем Беларуская грэка-каталіцкая царква чакае аднаўлення ўласнай іерархічнай структуры - экзархату - і прызначэнне экзархам святара - беларуса.

## ЛІТАРАТУРА


1. Янушевич И. Государственно-церковные отношения в Беларуси: уроки истории (1917 - 2002) // Гісторыя. Праблемы выкладання. - 2003. - № 3.
2. Канаплеў У. Праваслаўе на Беларусі: мінулае, сучаснае і будучыня // Звязда. - 1999. - 29 красавіка.
3. Киштымов А. Униатство и белорусская национальная идея: от Кастуся Калиновского до наших дней // Беларуская газета. - 1996. - № 35.
4. Царква//Унія. - 1990. - № 2.
5. Верашчагіна А.У., Гурко А.В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX ст. - Мн.: ІСПД, 1999.- 139 с.
6. Святая пакутніца унія // Ратуша. - 1993. - № 8.
7. Падокшын С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз). - Мн.: Беларуская навука, 1998. - 111 с.
8. ГорбікС. Шукаць свой шлях//ЛіМ. - 1991. - 12 ліпеня.
9. Сымон Б., Матусевіч Я. Хрысціянская царква: структура, іерархія, унутранае жыццё // Беларускі гістарычны часопіс. - 1997. - № 2.
10. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII - XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава. - Мн.: Экаперспектыва, 1998. - 340 с.
11. Шлях да Хрыста. - 1999. - № 2.
12. Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. - 1993. - № 2.